Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

УДК 37.02: [398.82+7.077](043.3)

**Петухова
Наталля Вячаславаўна**

# ФАРМІРАВАННЕ ЭСТЭТЫЧНАГА ЎСПРЫМАННЯ ПРЫРОДЫ Ў ПАДЛЕТКАЎ – УДЗЕЛЬНІКАЎ АМАТАРСКІХ ФАЛЬКЛОРНЫХ КАЛЕКТЫВАЎ

**Аўтарэферат**
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата педагагічных навук

па спецыяльнасці 13.00.05 – тэорыя, методыка і арганізацыя
сацыяльна-культурнай дзейнасці

Мінск, 2012

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Работа выканана на кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**Навуковы кіраўнік –** **Грыгаровіч Ядвіга Дамінікаўна**, доктар педагагічных навук, прафесар, прафесар кафедры педагогікі СКД УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**Афіцыйныя апаненты:** **Малахава Ірына Аляксандраўна,** доктар педагагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры псіхалогіі і педагогікі УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**Катовіч Наталля Канстанцінаўна,** кандыдат педагагічных навук, дацэнт, начальнік упраўлення выхаваўчай і ідэалагічнай работы Навукова-метадычнай установы «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

**Апануючая арганізацыя –** УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

Абарона адбудзецца 31 студзеня 2013 года ў 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый К 09.03.01 пры УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» па адрасе: 220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17, чытальная зала, e-mail: bguki_IC@tut.by; тэл. вучонага сакратара 222-83-36.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Аўтарэферат разасланы 20 снежня 2012 года.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
кандыдат педагагічных навук,
дацэнт Л.І. Казлоўская

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# КАРОТКІЯ ЎВОДЗІНЫ

Ідэя гарманізацыі адносін паміж чалавекам і прыродай у выхаванні новага пакалення сёння з’яўляецца адной з прыярытэтных. Навукова-тэхнічны прагрэс, які палегчыў жыццё чалавека, адначасова нанёс вялікую шкоду прыродзе, спарадзіўшы экалагічны крызіс. Галоўная прычына ўзнікнення экалагічных праблем бачыцца ў характэрным для сучаснага грамадства рацыянальным, спажывецкім, утылітарна-практычным тыпе ўзаемадзеяння з прыродай, які выцясняе разважлівасць, усведамленне шкоды, якая наносіцца прыродзе, што, у сваю чаргу, вядзе да празмернай эксплуатацыі біясферы і ў выніку да яе знішчэння.

Менавіта таму праблема станаўлення асобы, адказнай за паспяховае існаванне і гарманічнае развіццё грамадства ў экалагічна ўраўнаважаным асяроддзі, з’яўляецца прадметам няспыннага педагагічнага пошуку. Узнікае неабходнасць фарміравання экалагічнай свядомасці новага пакалення, што немагчыма без развіцця эстэтычнага ўспрымання прыроды, якое па сваім змесце выключае спажывецкае, утылітарнае стаўленне да яе. Сутнасць эстэтычнага ўспрымання прыроды заключаецца ў тым, што пры зносінах з ёй у асобы абуджаюцца такія эмоцыі, як захапленне, радасць, здзіўленне, замілаванне, спачуванне, якія вызначаюць характар мыслення і паводзін чалавека, робяць больш змястоўнымі яго экалагічныя веды.

Навучыць падлеткаў рэагаваць на веліч і прыгажосць прыроды, адчуваць яе гармонію і выразнасць – найважнейшая педагагічная задача. Яе вырашэнню і прысвечана дадзеная дысертацыйная работа, якая скіравана на даследаванне ўмоў, шляхоў і сродкаў фарміравання ў падлеткаў эстэтычнага ўспрымання прыроды ў працэсе аматарскай мастацкай дзейнасці фальклорных калектываў.

Фальклор – значны сродак фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды і гарманізацыі эстэтычных адносін чалавека да яе. Яго творы абуджаюць у падлеткаў цікавасць да прыгожых і таямнічых поглядаў нашых продкаў на прыродны свет, скіроўваюць іх на засваенне эстэтычных традыцый, ідэалаў беларускага народа. Пры гэтым асабліва важным з’яўляецца ўсведамленне зместу і сэнсу фальклорных твораў, якія абуджаюць глыбокія эстэтычныя пачуцці і перажыванні і настройваюць на ўспрыманне аб’ектаў прыроднага наваколля. Развіццё эстэтычнага ўспрымання прыроды сродкамі фальклору патрабуе непасрэднага ўдзелу асобы ў народных мастацкіх дзеях, засваення і аднаўлення сцверджаных супольнасцю псіхалагічных мадэлей паводзін, увасобленых у мастацкіх вобразах.

Рэалізацыя дадзенага падыходу сёння істотна запаволена ў практыцы аматарскіх фальклорных калектываў з-за арыентацыі выхавання пераважна на канцэртную дзейнасць. Захапленне сцэнічна эфектным матэрыялам, імкненне да ўдасканалення выканальніцкага майстэрства вядуць да культурнай дэзадаптацыі падлеткаў. У выніку назіраюцца адрыў ад культурнай пераемнасці, нежаданне вывучаць і захоўваць шматвекавыя культурныя народныя традыцыі, што істотна збядняе выкарыстанне педагагічнага патэнцыялу фальклору і адмоўна ўплывае на эстэтычнае развіццё падлеткаў.

Адсутнасць комплексных даследаванняў па дадзенай тэме абумовіла неабходнасць вызначэння сутнасці паняцця «эстэтычнае ўспрыманне прыроды»,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

структурных кампанентаў, крытэрыяў і ўзроўняў яго развіцця, вызначэння педагагічных умоў, распрацоўкі метадаў, форм і сродкаў работы кіраўніка аматарскага калектыву па эфектыўным фарміраванні ў падлеткаў эстэтычнага ўспрымання прыроды на матэрыяле лепшых узораў фальклорнай спадчыны.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

### Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі (праектамі) і тэмамі

Дысертацыйнае даследаванне выконвалася ў межах комплексных навукова-даследчых тэм кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» «Выхаванне творчага патэнцыялу асобы сродкамі сацыякультурнай дзейнасці» (дзяржаўная рэгістрацыя № 20066711) і кафедры этналогіі і фальклору «Традыцыйная духоўная культура беларускага народа: гістарычны вопыт, этнапедагагічныя каштоўнасці» (дзяржаўная рэгістрацыя № 20066716).

### Мэта і задачы даследавання

*Мэта* даследавання – распрацоўка тэарэтычных асноў і методыкі фарміравання ў падлеткаў эстэтычнага ўспрымання прыроды ў працэсе арганізаванай дзейнасці аматарскіх фальклорных калектываў.

Мэта прадвызначыла пастаноўку наступных *задач*:

1) удакладніць сутнасць і выявіць структурныя кампаненты фарміравання ў падлеткаў эстэтычнага ўспрымання прыроды;

2) раскрыць педагагічны патэнцыял фальклору ў фарміраванні ў падлеткаў эстэтычнага ўспрымання прыроды;

3) выявіць і абгрунтаваць сукупнасць педагагічных умоў эфектыўнага фарміравання ў падлеткаў эстэтычнага ўспрымання прыроды ў працэсе арганізаванай дзейнасці фальклорных калектываў;

4) распрацаваць, эксперыментальна праверыць і апрабаваць методыку фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды ў падлеткаў – удзельнікаў аматарскіх фальклорных калектываў.

### Аб’ект і прадмет даследавання

*Аб’ект* даследавання – працэс фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды ў падлеткаў сродкамі беларускага фальклору. *Прадмет* даследавання – методыка работы кіраўніка аматарскага фальклорнага калектыву па эфектыўным фарміраванні ў падлеткаў эстэтычнага ўспрымання прыроды.

Выбар аб’екта і прадмета даследавання абгрунтаваны тым, што значны педагагічны патэнцыял фальклору недастаткова ўжываецца ў якасці дзейснага сродку фарміравання ў падлеткаў эстэтычнага ўспрымання прыроды. Ліквідаваць гэты недахоп і эфектыўна выкарыстоўваць народную спадчыну ў мэтах фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды дазваляе дзейнасць аматарскіх фальклорных калектываў, якая вырашае важную культурна-асветніцкую задачу азнаямлення маладога пакалення з традыцыйнай духоўнай культурай беларускага народа.

### Палажэнні, якія выносяцца на абарону

1. *Эстэтычнае ўспрыманне прыроды* – гэта цэласны працэс адлюстравання аб’ектаў і з’яў прыроднага наваколля, які прыводзіць да пазнання і глыбокага спасціжэння іх эстэтычнай сутнасці. Пры гэтым прадметам пазнання выступаюць аб’ектыўныя ўласцівасці прыродных аб’ектаў, іх структура, форма, памер, каляровыя і дынамічныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асаблівасці і г.д. і выкліканыя імі суб'ектыўныя перажыванні, пачуцці рэцыпіента, якія рацыяналізуюцца праз эстэтычныя катэгорыі. Эстэтычнае ўспрыманне прыроды непарыўна звязана з эстэтычнымі патрэбнасцямі і інтарэсамі, ведамі асобы, яе пачуццямі і ідэаламі. Яно фарміруецца ў працэсе мэтанакіраванай мастацка-эстэтычнай дзейнасці, якая прадугледжвае цэласнае развіццё інтэлектуальна-рацыянальнай (эстэтычныя веды, меркаванні, ацэнкі), эмацыянальна-валявой (эстэтычнае сузіранне, эмоцыі, пачуцці, патрэбнасці) сфер і сферы паводзін асобы (эстэтычнае ўзаемадзеянне з прыродай). На гэтай падставе мы вылучаем кагнітыўны, эмацыянальны і дзейнасны *кампаненты фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды ў падлеткаў.*

2. Рэалізацыі *педагагічнага патэнцыялу фальклору ў фарміраванні эстэтычнага ўспрымання прыроды* садзейнічае засваенне падлеткамі эстэтычнай інфармацыі, светапоглядных ідэй, заключаных у паэтычным змесце твораў, якія фарміруюць уяўленні пра хараство беларускай прыроды, пра месца чалавека ў ёй, дапамагаюць засваенню эстэтычных катэгорый прыгожага і ўзвышанага, высокага і нікчэмнага, добрага і благога, гарманічнага і стыхійнага. Педагагічнае ўздзеянне фальклору ўзмацняе традыцыйна-побытавая практыка яго ўспрымання і засваення, якая, далучаючы падлеткаў да традыцыйных для беларускага народа звычаяў і свят, падчас якіх ажыццяўляецца трансляцыя сацыяльнага і эстэтычнага вопыту, прывучае іх да выканання норм і правілаў паводзін, прынятых у грамадстве.

Неабмежаваны педагагічны патэнцыял у фарміраванні эстэтычнага ўспрымання прыроды ўтрымлівае каляндарна-абрадавы фальклор, які традыцыйна накіраваны на камунікацыю з прыродай (персаніфікаванымі сезонамі, часткамі ландшафту і г.д.). Ён пашырае кола эстэтычных уражанняў і ведаў падлеткаў, садзейнічае засваенню мадэлей эстэтычных паводзін шляхам успрымання і інтэрпрэтацыі ва ўласнай мастацка-творчай дзейнасці разнастайных твораў народнага мастацтва: песень, танцаў, гульняў, карагодаў, дапасаваных да таго ці іншага прыроднага аб'екта.

3. Эфектыўнасць працэсу фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды ва ўдзельнікаў аматарскіх фальклорных калектываў залежыць ад якаснай рэалізацыі сукупнасці наступных *педагагічных умоў*: стварэння народна-творчага выхаваўчага асяроддзя, якое дазваляе аднавіць спецыфіку камунікацыйнага акта, асаблівасці ідэйна-эстэтычнай макрасферы традыцыйнага соцыуму падчас узаемадзеяння падлеткаў з фальклорнымі артэфактамі; арганізацыі працэсу засваення фальклору ў сінкрэтычных формах яго традыцыйнага бытавання, якія садзейнічаюць развіццю эстэтычнага кругагляду, асацыятыўнага мыслення ўдзельнікаў фальклорных калектываў; далучэння падлеткаў да эстэтычнага аналізу фальклорных твораў, які патрабуе разгляду паэтычнага зместу, семантыкі і мастацкіх сродкаў фальклорнай адзінкі з пазіцыі жанравай адметнасці і змешчаных у фальклорных творах эпітэтаў, параўнанняў, метафар, што ўвасабляюць прыроду, фарміруюць уяўленні пра яе прыгажосць; узбагачэння эстэтычных уражанняў выхаванцаў праз непасрэднае ўзаемадзеянне з натуральнымі аб'ектамі і з'явамі прыроды пасродкам удзелу ў святах каляндарнага цыкла ў натуральным прыродным ландшафце.

4. *Методыка фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды ва ўдзельнікаў аматарскіх фальклорных калектываў* прадугледжвае развіццё выдзеленых намі на аснове вызначэння сутнасці эстэтычнага ўспрымання прыроды кагнітыўнага,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эмацыянальнага і дзейнаснага кампанентаў праз распрацоўку зместу рэпетыцыйных заняткаў, метадаў, форм і сродкаў работы з падлеткамі.

Развіццё кагнітыўнага кампанента мае на мэце паглыбленне і пашырэнне ведаў падлеткаў у галіне міфалагічнага светапогляду і светаўспрымання беларусаў. У змест заняткаў уключаны тэмы, якія спрыяюць глыбокаму спасціжэнню эстэтычнай сутнасці фальклору, разуменню адлюстраванай у яго творах – сродках фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды – прыгажосці рэчаіснасці, з'яў прыроды, учынкаў чалавека. Знаёмства з казкамі, замовамі, паданнямі, легендамі, каляндарна-абрадавым фальклорам патрабуе выкарыстання славесных (гутарка, паведамленне, тлумачэнне), наглядных (ілюстрацыя, дэманстрацыя), практычных (практыкаванне) і іншых метадаў.

Актывізацыі эмацыянальнага кампанента садзейнічаюць экскурсіі, краязнаўчыя вандроўкі, наведванне ўдзельнікамі фальклорных калектываў выстаў народнай творчасці. Дадзеныя формы сацыякультурнай дзейнасці арганічна спалучаюцца з дэманстрацыяй удзельнікамі аматарскіх калектываў разнастайных твораў вусна-паэтычнай творчасці – прыказак, прымавак, загадак, прыкмет, павер'яў і г.д., у якіх адлюстроўваецца прырода. Непасрэднае ўзаемадзеянне з непаўторнымі, маляўнічымі прыроднымі мясцінамі і культурнымі аб'ектамі, назіранне за прыроднымі з'явамі і экспанатамі, пошук вобразна-асацыятыўных аналогій з разгледжанымі і развучанымі на занятках творамі фальклору – гэта метады, якія ўзбагачаюць эстэтычныя пачуцці падлеткаў, пашыраюць іх эмацыянальныя сувязі з прыродным наваколлем.

Фарміраванне дзейнаснага кампанента прадугледжвае сістэматычны ўдзел падлеткаў у канцэртах і конкурсах, фестывалях, шэсцях і масавых святах. Асаблівае значэнне надаецца арганізацыі і правядзенню традыцыйных каляндарна-абрадавых свят у натуральных прыродна-ландшафтных умовах, што арганічна спалучаецца з выхаваннем ашчадных, беражлівых адносін да прыроды (спальванне старых зношаных рэчаў і смецця на «Масленіцу», кармленне птушак на «Гуканне вясны», знаёмства з рэдкімі раслінамі на «Купалле» і г.д.). Прымяненне гэтых форм сацыякультурнай дзейнасці ў педагагічнай практыцы фальклорных калектываў патрабуе выкарыстання метадаў мастацкай рэпрэзентацыі прыродных аб'ектаў, рытуалізацыі эстэтычнай дзейнасці, экаактыўнасці і інш.

**Асабісты ўклад суіскальніка**

Дысертацыя ўяўляе сабой першае самастойнае закончанае тэарэтыка-прыкладное даследаванне, накіраванае на раскрыццё магчымасцей выкарыстання фальклору як сродку фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды ў падлеткаў – удзельнікаў аматарскіх фальклорных калектываў, вынікі якога ўзбагачаюць тэорыю і практыку арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці.

Аўтарам абагулены і сістэматызаваны педагагічныя погляды на фарміраванне ў падлеткаў эстэтычнага ўспрымання прыроды сродкамі фальклору; вызначаны і тэарэтычна абгрунтаваны педагагічныя ўмовы, якія садзейнічаюць павышэнню эфектыўнасці працэсу фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды ва ўдзельнікаў аматарскіх фальклорных калектываў; вылучаны кампаненты, крытэрыі, паказчыкі і ўзроўні сфарміраванасці эстэтычнага ўспрымання прыроды ў падлеткаў; распрацавана і апрабавана методыка фарміравання ў іх эстэтычнага ўспрымання прыроды сродкамі беларускага фальклору ў працэсе дзейнасці аматарскіх

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

фальклорных калектываў, распрацавана адпаведнае вучэбна-метадычнае забеспячэнне.

**Апрабацыя вынікаў даследавання**

Асноўныя навуковыя вывады і практычныя вынікі дысертацыйнага даследавання былі прадстаўлены на навуковых і навукова-практычных канферэнцыях міжнароднага і рэспубліканскага ўзроўняў: II Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання» (Мінск, 23 крас. 2008 г.), III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання» (Мінск, 29 крас. 2009 г.), IV Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання» (Мінск, 29–30 крас. 2010 г.), III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Фальклор і сучасная культура» (Мінск, 18 крас. 2011 г.), V Міжнароднай навукова-метадычнай канферэнцыі «Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання» (Мінск, 29–30 крас. 2011 г.), III Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Традыцыйная культура і дзеці. Праблема этнавыхавання» (г.п. Акцябрскі, 19–20 крас. 2006 г.), IV Рэспубліканскім навукова-метадычным семінары «Праблемы выкладання фальклору» (Мінск, 9 сн. 2010 г.), Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Культура ва ўмовах глабалізацыі» (Мінск, 3 сн. 2010 г.) і інш.

Асноўныя палажэнні дысертацыі абмяркоўваліся на пасяджэннях кафедры этналогіі і фальклору, кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў». У перыяд правядзення вопытна-эксперыментальнай работы ў аматарскіх фальклорных калектывах падрыхтаваны і ўкаранёны ў навучальны працэс УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» і мастацтваў вучэбныя праграмы па наступных дысцыплінах: «Методыка экспедыцыйных этнамузыкалагічных даследаванняў», «Этнапедагогіка».

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Матэрыялы даследавання знайшлі адлюстраванне ў 19 публікацыях аўтара, з іх 5 артыкулаў надрукавана ў навуковых рэцэнзуемых выданнях (2,5 др. а.), 9 – у матэрыялах канферэнцый (1,8 др. а.), 1 – у вучэбным дапаможніку «Педагогика ненасилия в социокультурной деятельности» (0,4 др. а.), 2 – у зборніках навуковых артыкулаў (0,5 др. а.), вучэбных праграмах па дысцыплінах «Методыка экспедыцыйных этнамузыкалагічных даследаванняў» (1,2 др. а.), «Этнапедагогіка» (0,7 др. а.). Агульны аб'ём апублікаванага матэрыялу – 7,1 др. а.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Структура дысертацыі падпарадкавана вырашэнню пастаўленых у рабоце задач і логіцы вывучэння аб'екта даследавання. Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі, дзвюх глаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу і дадаткаў, уключае 40 табліц і 6 малюнкаў. Поўны аб'ём дысертацыі – 173 старонкі, з іх 100 старонак займае асноўны тэкст, 23 старонкі – бібліяграфічны спіс, які ўключае 282 крыніцы (на беларускай, рускай, украінскай, англійскай і нямецкай мовах) і спіс публікацый суіскальніка (19 найменняў), 50 старонак займаюць дадаткі (18 найменняў).

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

**У першай главе «Тэарэтычныя асновы фарміравання ў падлеткаў – удзельнікаў аматарскіх фальклорных калектываў эстэтычнага ўспрымання**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**прыроды»** на аснове аналізу філасофскай, псіхалагічнай і педагагічнай літаратуры разгледжаны тэарэтычныя аспекты праблемы даследавання: вызначана сутнасць паняцця «эстэтычнае ўспрыманне прыроды», ахарактарызаваны асаблівасці яго фарміравання ў падлеткаў, абгрунтаваны метадалагічныя асновы распрацоўкі педагагічных умоў і методыкі фарміравання ў падлеткаў эстэтычнага ўспрымання прыроды ў працэсе дзейнасці аматарскіх фальклорных калектываў.

*Раздзел 1.1 «Сутнасць паняцця “эстэтычнае ўспрыманне прыроды”»* прысвечаны выяўленню зместу паняцця, яго эвалюцыі ў айчыннай і замежнай навуцы. Дадзеныя пытанні ўсебакова асвячаюцца ў навуковых працах філосафаў (Г.З. Апрэсян, Ю.Б. Борэў, П.С. Карака, М.І. Кіяшчанка, К.М. Майер-Абіх, Ю.М. Пахомаў, Й. Сепанмаа, І.Ф. Смальянінаў і інш.), псіхолагаў (Д. Гібсан, Л.М. Рожына, С.Л. Рубінштэйн, А.А. Мелік-Пашаеў, З.Н. Наўлянская, Е.М. Таршылава, Г.В. Шэйніс і інш.), класікаў педагогікі (А. Дзістэрвег, Я.А. Каменскі, Дж. Лок, Й. Песталоцы, Ж.-Ж. Русо, В.А. Сухамлінскі, К.Д. Ушынскі), сучасных педагогаў (А.Ж. Аўчыннікава, А.А. Вярэм’еў, Л.М. Гафарава, Я.Д. Грыгаровіч, Н.Р. Купрына, Б.Ц. Ліхачоў, Б.М. Няменскі, А.А. Паловіна, М.В. Раганава, Н.У. Самерсава, А.П. Сідзялькоўскі, Ю.М. Усаў, А.К. Шульжэнка, І.І. Ярыта і інш.). Даследаванні вучоных дазваляюць зрабіць выснову, што эстэтычнае ўспрыманне прыроды выяўляецца праз пачуцці, меркаванні і дзейнасць чалавека, мае пазнавальны і вобразна-асацыятыўны характар. Як актыўная форма эмацыянальна-пачуццёвага адлюстравання эстэтычнае ўспрыманне прыроды адначасова ахоплівае і ацэньвае выразныя ўласцівасці аб’ектаў і з’яў прыроднага наваколля, іх форму, колер, рытм, гук, якія выклікаюць бескарысную радасць пачуццяў, спараджаюць задавальненне неўтылітарнага кшталту.

У навуковай літаратуры акрэслены розныя аспекты сутнасці эстэтычнага ўспрымання прыроды: гнасеалагічны, аксіялагічны і праектыўна-нарматыўны. Вывучэнне гнасеалагічнага аспекту прадмета даследавання дазволіла прасачыць узаемасувязь эстэтычнага ўспрымання прыроды з працэсамі пазнання навакольнай рэчаіснасці. Згодна з поглядамі Р. Арнхейма, Л.С. Выгоцкага, А.М. Лявонцьева, А. Маслоу, А.А. Мелік-Пашаева, З.Н. Наўлянскай, Л.М. Рожынай, С.Л. Рубінштэйна, Е.М. Таршылавай, Г.В. Шэйніса, П.М. Якабсона і інш., эстэтычнае ўспрыманне накіравана на лагічнае спасціжэнне прадмета, засваенне яго ўнутранага зместу, якое выражаецца ў паняццях, меркаваннях і ацэнках чалавека. Прадметам пазнання з’яўляюцца структура, форма, каляровыя і гукавыя асаблівасці прыродных аб’ектаў і з’яў і эстэтычныя перажыванні, пачуцці рэцыпіента, якія выклікаюць эстэтычную патрэбнасць у бескарысным сузіранні прыроды.

У працах, прысвечаных аксіялагічнаму аспекту эстэтычнага ўспрымання прыроды (А.Ж. Аўчыннікава, А.А. Вярэм’еў, Н.Р. Купрына, Э.Ф. Маскалёва, Л.П. Пячко, А.П. Сідзялькоўскі, В.А. Сухамлінскі, Г.П. Шаўчэнка, А.К. Шульжэнка і інш.), раскрываецца сістэма эстэтычных каштоўнасцей грамадства, якая выступае асновай фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды асобы ў працэсе яе зносін з творамі мастацтва і навакольнай рэчаіснасцю.

Праектыўна-нарматыўны аспект эстэтычнага ўспрымання прыроды адлюстраваны ў працах Г.З. Апрэсяна, Ю.Б. Борава, А.І. Бурава, Я.Д. Грыгаровіч, М.І. Кіяшчанкі, Б.Ц. Ліхачова, Ю.М. Пахомава, І.Ф. Смальянінава і інш. На іх думку, эстэтычнае ўспрыманне стымулюе эстэтычную актыўнасць асобы. Як рухаючая сіла эстэтычных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

патрэбнасцей, інтарэсаў, мэт і планаў чалавека, яно стварае эмацыянальны настрой на творчую дзейнасць, абуджае імкненне да ўзаемадзеяння з эстэтычным аб’ектам па законах прыгажосці.

Навуковыя даследаванні С.Д. Дзераба, Б.Ц. Ліхачова, Л.П. Пячко, Н.У. Самерсавай, Л.М. Чамаевай, М.В. Шаптухоўскага, В.А. Ясвіна і іншых сведчаць аб неабходнасці інтэнсіўнага развіцця эстэтычнага ўспрымання прыроды менавіта ў падлеткавым узросце, якому ўласціва крайняя няўстойлівасць эколага-эстэтычнай культуры. У падлеткавым узросце адбываецца рэзкі рост прагматычных матываў успрымання прыроды, якія суправаджаюцца наіўным уяўленнем, што прыгажосцю можна валодаць як нейкай матэрыяльнай каштоўнасцю і распараджацца ёю на свой погляд. Многія падлеткі праяўляюць жорсткія адносіны да жывёл і раслін, што звязана з усплёскам агрэсіўнасці, назапашанай з-за праблем псіхафізіялагічнай і сацыяльнай няспеласці. Яны дэманструюць неразвітасць эстэтычнага ўспрымання прыроды, абмяжоўваючыся арыентацыяй толькі на «прыгожае – агіднае», якая адказвае бытавому ўзроўню свядомасці, вядзе да падтрымкі варварскага спажывання прыродна-прыгожага і апраўдвае знішчэнне ўсяго, што ілжыва ацэньваецца як прыродна-агіднае.

Дапамагчы падлеткам справіцца з дысгарманічнымі паводзінамі можна, актывізуючы іх эстэтычныя пачуцці да прыроды: ад ідэальна-пазітыўных (узвышанае, прыгожае, гарманічнае, дасканалае і г.д.) да афектыўна-экспрэсіўных (стыхійнае, трагічнае, дысгарманічнае і г.д.), далучаючы да працэсу эстэтычнага сузірання, асэнсавання і ацэнкі выразных асаблівасцей прыродных аб’ектаў і з’яў. Гэта патрабуе ад педагога стварэння разнастайных вучэбна-выхаваўчых сітуацый, якія прадугледжваюць спасціжэнне мастацка-эстэтычных ведаў, засваенне грамадскіх ідэалаў, форм адносін да прыроды, назапашванне эстэтычных уражанняў, развіццё эмацыянальнай успрымальнасці прыгажосці прыродных з’яў, вобразнага мыслення, творчага ўяўлення. Асаблівая роля ў гэтым працэсе належыць фальклору, які ў сваіх разнастайных жанрах і паэтычных вобразах увасабляе прыгажосць прыроды і эстэтычныя адносіны чалавека да яе.

*У раздзеле 1.2 «Педагагічны патэнцыял фальклору падчас фарміравання ў падлеткаў эстэтычнага ўспрымання прыроды»* характарызуецца фальклор як сродак фарміравання ў падлеткаў эстэтычнага ўспрымання прыроды.

Аналіз навуковай літаратуры дазваляе вылучыць этнакультурны, традыцыйна-побытавы і комплексны падыходы, якія раскрываюць педагагічны патэнцыял фальклору ў фарміраванні эстэтычнага ўспрымання прыроды. Этнакультурны падыход адлюстраваны ў працах Е.Г. Баронінай, Г.М. Волкава, А.А. Грымаця, В.М. Кузьміной і інш. Згодна з іх поглядамі, выкарыстанне асобных жанраў фальклору пашырае кола эстэтычных уражанняў і ведаў асобы, узбагачае яе эстэтычны вопыт шляхам засваення этнакультурнай інфармацыі, светапоглядных ідэй, заключаных у паэтычным змесце твораў, якія садзейнічаюць развіццю здольнасці да перажывання прыгажосці прыроднага свету і ўсведамленню яго гармоніі як універсальнага закону жыцця.

Сутнасць традыцыйна-побытавага падыходу раскрыта ў працах А.М. Аляхновіча, Н.П. Андрэевай, Г.П. Бажадонавай, Г.А. Барташэвіч, Г.Б. Сакаловай, В.І. Саладухіна і інш. Даследчыкі сцвярджаюць, што аптымізацыі педагагічнага патэнцыялу фальклору садзейнічае выкарыстанне традыцыйна-побытавай практыкі яго ўспрымання і засваення, прадстаўленай такімі характэрнымі канстытуцыйнымі прыкметамі, як



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вуснасць, традыцыйнасць, варыятыўнасць, сінкрэтызм, калектыўнасць. Менавіта яны паглыбляюць асобу ў фальклорную культуру, дзе ажыццяўляюцца трансляцыя сацыяльнага і эстэтычнага вопыту, засваенне і аднаўленне найбольш устойлівых, сцверджаных супольнасцю стэрэатыпаў паводзін, увасобленых у мастацкіх вобразах.

У межах нашага даследавання асаблівую значнасць набывае комплексны падыход, які найбольш выразна прадстаўлены ў даследаваннях Г.П. Арловай, В.С. Болбаса, Л.Л. Ражковай, В.А. Салеева, І.І. Сучкова і інш. Рэалізацыя дадзенага падыходу ў мастацка-творчай дзейнасці аматарскіх фальклорных калектываў прадугледжвае мэтанакіраванае развіццё эстэтычных ведаў падлеткаў шляхам інтэрыярызацыі эстэтычнага зместу фальклорнага матэрыялу ў кантэксце прасторава-часавых умоў яго рэалізацыі і актыўнае рэпрадуцыраванне атрыманай змястоўнай інфармацыі ў сучасную сацыякультурную прастору ў формах канцэртна-выканальніцкай, рэкрэацыйна-асветніцкай дзейнасці, а таксама на ўзроўні традыцыйна-побытавай трансляцыі.

*У раздзеле 1.3 «Педагагічныя ўмовы фарміравання ў падлеткаў эстэтычнага ўспрымання прыроды ў працэсе дзейнасці аматарскіх фальклорных калектываў»* паказана, што спосабы, прыёмы і сродкі вырашэння педагагічных задач, прысвечаных развіццю ў падлеткаў эстэтычнага ўспрымання прыроды падчас заняткаў у фальклорных калектывах, вызначаюць асноўныя функцыі сацыякультурнай дзейнасці (выхаваўчая, інфармацыйна-асветніцкая, культурастваральная, адукацыйна-развіваючая і камунікатыўная) і дадатковыя функцыі, якія практыкуюць распаўсюджванне і папулярызацыю фальклору ў сучасным грамадстве, вяртанне да народнай культурнай спадчыны (засваення, прапаганды і рэканструкцыі фальклору, этнічнай самарэалізацыі асобы, пашырэння суб’екта фальклорнай дзейнасці). Вышэйпералічаныя функцыі рэалізуюцца ў адпаведнасці з наступнымі прынцыпамі дзейнасці аматарскага фальклорнага калектыву: добраахвотнасці, даступнасці, сістэматычнасці, паслядоўнасці, індывідуальнага падыходу, ініцыятывы і самадзейнасці.

Намі вызначаны і абгрунтаваны асноўныя педагагічныя ўмовы паспяховага фарміравання ў падлеткаў эстэтычнага ўспрымання прыроды ў творчай дзейнасці аматарскіх фальклорных калектываў. Першай і найважнейшай умовай з’яўляецца стварэнне народна-творчага выхаваўчага асяроддзя, якое дазваляе аднавіць спецыфіку камунікацыйнага акта, асаблівасці ідэйна-эстэтычнай макрасферы традыцыйнага соцыуму падчас узаемадзеяння падлеткаў з фальклорнымі артэфактамі. Яно павінна спалучаць этнічнае (мову народа, яго светапогляд, матэрыяльную і духоўную культуру, сістэму звычаяў, абрадаў і свят), музычнае (народную музыку ў запісе, у выкананні носьбітамі вуснай традыцыі і прафесійнымі музыкантамі) і выхаваўчае (калектыў аднагодкаў, творчыя стасункі з удзельнікамі іншых фальклорных калектываў, з носьбітамі фальклору, узаемадзеянне з сям’ёй) атачэнне. Такое асяроддзе, максімальна варыятыўнае і разнастайнае па змесце, дазваляе найбольш эфектыўна ўцягваць падлеткаў у засваенне фальклору, што садзейнічае іх эстэтычнаму і духоўнаму ўдасканаленню, развіццю эмацыянальна-пачуццёвай сферы і інтэлекту. Рэалізацыя другой педагагічнай умовы прадугледжвае арганізацыю працэсу засваення фальклору ў сінкрэтычных формах яго традыцыйнага бытавання, сукупнасці песень, танцаў, карагодаў, казак, легенд, якія з’яўляюцца крыніцай эстэтычных ведаў, эфектыўным сродкам развіцця асацыятыўнага мыслення, эмацыянальнай чуласці ўдзельнікаў фальклорнага калектыву.

Трэцяя ўмова – актыўнае далучэнне падлеткаў да эстэтычнага аналізу



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фальклорных твораў, якi патрабуе разгляду паэтычнага зместу, семантыкі і мастацкіх сродкаў фальклорнай адзінкі з пазіцыі жанравай адметнасці і змешчаных у фальклорных творах эпітэтаў, параўнанняў, метафар, што ўвасабляюць прыроду, фарміруюць уяўленні пра яе прыгажосць. Успрыманне і аналіз змешчанай у фальклорных творах эстэтычнай інфармацыі вядзе да засваення асобай эстэтыкі, духоўнасці і гармоніі, закладзеных у змесце фальклорнай адзінкі, дапамагае ўзнавіць ва ўяўленні адэкватныя прыродныя вобразы, глыбока ўсвядоміць і засвоіць іх эстэтычны змест. Чацвёртая, вызначальная, умова прадугледжвае ўзбагачэнне эстэтычных уражанняў і ведаў падлеткаў праз непасрэднае ўзаемадзеянне з прыроднымі аб’ектамі і з’явамі пасродкам удзелу ў святах каляндарнага цыклу ў натуральным ландшафце. Успрыманне маляўнічай прыроды ў спалучэнні з трансляцыяй фальклорных твораў дапамагае падлеткам усвядоміць значнасць і эстэтычную каштоўнасць прыгажосці навакольнага свету, садзейнічае назапашванню вопыту гарманічных паводзін у прыродным асяроддзі.

**У другой главе «Удасканаленне працэсу фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды ва ўдзельнікаў аматарскіх фальклорных калектываў»** адлюстравана эксперыментальная работа, якая ўключала некалькі этапаў: канстатуючы (2008 г.), фарміруючы (2008–2010 гг.) і кантрольны (2011 г.).

Вынікі канстатуючага эксперымента прыводзяцца *ў раздзеле 2.1 «Дыягностыка сфарміраванасці ў падлеткаў эстэтычнага ўспрымання прыроды».* На дадзеным этапе ажыццяўлялася працэдура фарміравання рэпрэзентатыўнай выбаркі і вызначэння складу ўдзельнікаў эксперыментальнай і кантрольнай груп пры дапамозе дыягностыкі зыходнага ўзроўню сфарміраванасці эстэтычнага ўспрымання прыроды. У эксперыментальную групу ўваходзілі аматарскія фальклорныя калектывы «Сунічка» Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Кантакт» Цэнтральнага раёна г. Мінска і «Рамонак» Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Маяк» Ленінскага раёна г. Мінска (83 чалавекі), у кантрольную – калектывы «Кірмаш» сярэдняй школы № 200 г. Мінска, «Квецень» Нацыянальнага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі г. Мінска, «Гарлачыкі» сярэдняй школы № 3 г. Мінска (85 чалавек). Усяго ў даследаванні ўдзельнічала 168 чалавек ва ўзросце ад 11 да 15 гадоў.

Падчас канстатуючага эксперымента былі ахарактарызаваны кампаненты, вылучаны крытэрыі і паказчыкі сфарміраванасці эстэтычнага ўспрымання прыроды ва ўдзельнікаў аматарскіх фальклорных калектываў. Асновай для дыягностыкі кагнітыўнага кампанента развіцця ў падлеткаў эстэтычнага ўспрымання прыроды сталі наступныя крытэрыі: разуменне мастацкага зместу эстэтычнага пераўтварэння прыродных вобразаў у фальклорных творах і ўменне падлеткаў аргументаваць уласныя эстэтычныя меркаванні на аснове аналізу разнастайных фальклорных твораў. Паказчыкі першага крытэрыю адлюстроўваюць глыбіню, аб’ём ведаў падлеткаў аб спецыфіцы абрадавай і святочнай культуры беларусаў, асаблівасцях міфалагічнага і эстэтычнага ўспрымання прыроды нашымі продкамі. Паказчыкамі другога крытэрыю з’яўляюцца ўменні пераканаўча і лагічна аргументаваць свае эстэтычныя меркаванні, погляды і перакананні, кіруючыся наяўнымі ведамі ў галіне міфалагічнага светапогляду і светаўспрымання беларусаў з выкарыстаннем пэўных тэрмінаў.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Для дыягностыкі эмацыянальнага кампанента фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды ў падлеткаў, занятых аматарскай творчасцю, намі былі абраныя наступныя крытэрыі: любаванне прыгажосцю, гукамі і фарбамі прыроды, эмпатыя і суперажыванне прыродзе. Паказчыкам крытэрыю «любаванне прыгажосцю, гукамі і фарбамі прыроды» выступаюць уменні заўважаць, вылучаць і адэкватна ўспрымаць пэўныя ўласцівасці прыродных аб’ектаў, атрымліваць разнастайныя эстэтычныя ўражанні, задавальненне падчас стасункаў з прыродай. Паказчык крытэрыю «эмпатыя і суперажыванне прыродзе» характарызуе праяўленне негатыўных адносін да разбуральных паводзін у прыродным асяроддзі, спагадлівасць падлеткаў да розных праяў жыцця жывёл.

Асновай для дыягностыкі дзейнаснага кампанента сталі такія крытэрыі, як цікавасць да эстэтычнай дзейнасці, патрэбнасць у бескарысным сузіранні прыроды. Першы крытэрый адлюстроўвае жаданне падлеткаў увасабляць прыгажосць прыроды ў вершах, песнях, фотаздымках і інш. Асноўным паказчыкам другога крытэрыю з’яўляецца імкненне ўдзельнікаў аматарскага фальклорнага калектыву да прыгожых, гарманічных і адказных паводзін у прыродным асяроддзі і яго рэалізацыя.

На аснове раскрыцця зместу кампанентаў фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды ў падлеткаў – удзельнікаў аматарскіх фальклорных калектываў былі вылучаны тры ўзроўні сфарміраванасці кожнага з кампанентаў: аптымальны, абмежаваны, павярхоўны, распрацаваны і апрабаваны дыягнастычны інструментарый. Дыягностыка кагнітыўнага кампанента праводзілася на падставе адаптаваных намі з улікам узроставых асаблівасцей падлеткаў тэставых заданняў І.В. Казаковай. Даследаванне эмацыянальнага і дзейнаснага кампанентаў фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды праведзена на аснове перапрацаваных паводле нашага даследавання методык «Альтэрнатыва» і «Натурафіл» С.Д. Дзeрaбa і В.А. Ясвіна.

Даныя канстатуючага эксперымента паказалі, што ўдзельнікі эксперыментальных і кантрольных калектываў маюць пераважна абмежаваны і павярхоўны ўзроўні сфарміраванасці кампанентаў эстэтычнага ўспрымання прыроды. Вынікі дыягностыкі сведчаць аб тым, што толькі 5,50 % падлеткаў з эксперыментальнай групы і 4,00 % з кантрольнай паказалі аптымальны ўзровень развіцця кагнітыўнага кампанента. Большасць апытаных на недастатковым узроўні ведаюць і разумеюць асаблівасці светаўспрымання беларускага народа, яго ўяўленні аб прыгажосці навакольнага свету і гарманічных узаемаадносінах з прыродай. Многія ўвогуле не здолелі сфармуляваць адказы на пытанні. Таксама было высветлена, што большасць удзельнікаў эксперыментальнай (40,75 %) і кантрольнай (45,00 %) груп прадэманстравалі абмежаваны ўзровень развіцця эмацыянальнага кампанента, ім уласціва невыразнае праяўленне эстэтычных эмоцый і пачуццяў, абыякавыя адносіны да разбуральных, антыгуманных паводзін у прыродным асяроддзі. Дыягностыка паказала, што 31,00 % падлеткаў эксперыментальнай і 33,75 % кантрольнай груп маюць павярхоўны ўзровень дзейнаснага кампанента фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды. Яны ўспрымаюць прыроду як аб’ект практычнага выкарыстання: для іх яна не з’яўляецца крыніцай эмацыянальнага натхнення і эстэтычнай інфармацыі.

Сутнасць фарміруючага эксперымента раскрыта *ў раздзеле 2.2 «Методыка фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды ва ўдзельнікаў аматарскіх фальклорных калектываў»*. Сістэмастваральным падмуркам методыкі і яе сэнсавай

асновай з'яўляецца дыферэнцыяцыя зместу рэпетыцыйных заняткаў, метадаў, форм і сродкаў работы з падлеткамі па трох асноўных напрамках дзейнасці фальклорных калектываў, да якіх адносяцца: пазнавальны, канцэртна-выканальніцкі і рэкрэацыйна-асветніцкі. Кожны з напрамкаў прадугледжвае фарміраванне выдзеленых намі на аснове вызначэння сутнасці эстэтычнага ўспрымання прыроды кагнітыўнага, эмацыянальнага і дзейнаснага кампанентаў.

Для ўдасканалення кагнітыўнага кампанента намі былі выкарыстаны групавыя і індывідуальныя формы работы, а таксама славесныя (паведамленне, гутарка, тлумачэнне), наглядныя (ілюстрацыя, дэманстрацыя), практычныя (практыкаванне) і іншыя метады. У змест заняткаў былі ўключаны наступныя тэмы для правядзення гутарак і паведамленняў: «Паэтычныя погляды нашых продкаў на прыроду», «Насякомыя ў беларускім фальклоры», «Шанаванне птушак у беларускай традыцыі», «Жывёльны свет у міфалагічнай свядомасці нашых продкаў», «Шанаванне зямлі ў традыцыйнай культуры Беларусі», «Водная стыхія ў міфалогіі Беларусі», «Шанаванне расліннага свету старажытнымі беларусамі» і інш.

Вышэйзгаданыя гутаркі і паведамленні суправаджаліся праглядам кінафільмаў З.Я. Мажэйкі «Голоса веков», «Пранясі, Божа, хмару», «Рух зямлі» і непасрэдным успрыманнем і спасціжэннем фальклорных твораў – сродкаў фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды, сярод якіх: народныя казкі «Казёл і пчала» (вёска Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці), «Сварлівае балота» (вёска Казацкія Балсуны Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці), песні «А заспорыў Дунай з морам» (вёска Зачэпічы Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці), «Вол бушуе, вясну чуе» (вёска Ананчыцы Салігорскага раёна Мінскай вобласці), легенды «Чаму павука біць нельга» (вёска Бярдовічы Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці), «Чаму сабакі і каты адзін аднаго не любяць» (вёска Рэдзігерава Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці) і інш. Успрыманне падлеткамі цэласнасці і гармоніі прыроднага свету ў яго мастацкім адлюстраванні, суаднясенне мастацкага зместу з непасрэднымі жыццёвымі ўражаннямі, асабістымі назіраннямі дапамаглі раскрыць асноўныя светапоглядныя канстанты фальклору, якія адлюстроўваюць узаемаадносіны чалавека з прыродай.

Для развіцця эмацыянальнага кампанента выкарыстоўваліся распаўсюджаныя формы арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці: экскурсіі, краязнаўчыя вандроўкі, наведванне ўдзельнікамі фальклорных калектываў выстаў народнай творчасці. Аб'ектамі экскурсійнай дзейнасці былі як прыродныя, так і культурныя помнікі, ландшафты, дзе культура і прырода выступалі ў непарыўным адзінстве: «Святая крыніца» (г. Мінск, мікрараён Вяснянка), Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту (пасёлак Азярцо Мінскай вобласці), адукацыйна-экалагічная сцежка пры палацава-паркавым комплексе «Lasy Warcinsko-Pólanowskie» (м. Варчына, Польшча).

З мэтай актывізаваць мастацкія ўражанні, асацыяцыі, аналогіі і іх праекцыі на прыродны свет падлеткам падчас правядзення экскурсій і вандровак былі прапанаваны творчыя заданні, напрыклад, знайсці ў жывой прыродзе пэўныя з'явы і ўласцівасці, адлюстраваныя ў засвоеных на папярэдніх занятках празаічных творах фальклору. Выдатнымі прыкладамі з'яўляюцца народны жарт «Прыроду не пераможаш» (вёска Бярдовічы Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці), легенды «Адкуль жаваранак» (вёска Варанілавічы Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці), «Чаму вераб'ёў крыўдзіць нельга» (вёска Войстам Смаргонскага раёна Гродзенскай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вобласці), песні «Ой, бяроза белая» (вёска Раеўшчына Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці), «Купала, купала, дзе ты прабувала» (вёска Багатырская Полацкага раёна Віцебскай вобласці) і інш. Такія стасункі з жывой прыродай глыбока закранулі пачуцці і розум падлеткаў, абудзілі патрэбнасць у суаднясенні па прынцыпе падабенства вобразаў прыроды з узвышанымі якасцямі чалавека, якія ўвасабляюць эстэтычны ідэал, дабро, справядлівасць, ісціну. Непасрэднае назіранне за прыроднымі з'явамі і культурнымі аб'ектамі, а таксама іх ацэнка як крыніцы глыбокіх эстэтычных перажыванняў і пачуццяў чалавека – гэта метады, якія садзейнічалі павышэнню ўзроўню эмацыянальнай спагадлівасці, спачування і суперажывання прыродзе.

Эфектыўнае развіццё дзейнаснага кампанента прадугледжвала выкарыстанне наступных форм сацыякультурнай дзейнасці: удзел у канцэртах і конкурсах, шэсцях, фестывалях і масавых святах, у нацыянальных святах і абрадах – і сродкаў: песень, танцаў, гульняў, карагодаў і інш. Асаблівае значэнне для ўдасканалення дадзенага кампанента належыць арганізацыі і правядзенню святаў каляндарнага цыкла ў натуральных прыродна-ландшафтных умовах, што дазволіла ўдзельнікам аматарскіх фальклорных калектываў уключыцца ў полімастацкую, сінкрэтычную абрадавую сітуацыю, перажыць яе і гэтым пашырыць свой уласны вопыт эстэтычнага ўзаемадзеяння з рэальнымі аб'ектамі і з'явамі прыроды. Падлеткі з задавальненнем прымалі ўдзел у каляндарна-абрадавых святах, праяўлялі цікавасць да іх арганізацыі, рыхтавалі рэквізіт, разгорнутыя паведамленні па вызначаных тэмах і неабходны для вывучэння музычны і танцавальна-гульнёвы матэрыял.

Актывізацыі эстэтычнай думкі падлеткаў садзейнічалі вывучэнне і наступнае выкананне ў абрадавай сітуацыі разнастайных твораў фальклору, дапасаваных да пэўнага каляндарнага свята. Гэта дазволіла ўдзельнікам калектываў шляхам пераносу, праз параўнальна-супастаўляльныя характарыстыкі прасачыць узаемасувязь народнага мастацтва з жыццём прыроды, стаўленнем чалавека да яе, актуалізаваць сінхранічныя паралелі і спасцігнуць эстэтычную блізкасць розных фальклорных твораў, што садзейнічала найбольш цэласнаму асэнсаванню культурнай спадчыны Беларусі, фарміраванню пачуцця прыналежнасці да роднага краю і роднай прыроды.

Дзейнасць па арганізацыі і правядзенні каляндарна-абрадавых свят арганічна спалучалася з выхаваннем ва ўдзельнікаў фальклорных калектываў ашчадных, беражлівых адносін да прыроды. На свята «Масленіца – белы сыр» (Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту, пасёлак Азярцо Мінскай вобласці) падлеткі на вогнішчы спальвалі старыя, зношаныя, сапсаваныя рэчы і смецце, на «Гуканне вясны» (Цэнтральны дзіцячы парк імя М. Горкага г. Мінска) прыносілі загадзя падрыхтаваныя мучныя вырабы, якія падчас выканання веснавых песень «Агу вясна, агу красна», «Жавароначкі прыляціце» і іншымі падкідвалі ўгору і пакідалі для першых веснавых птушак. Напярэдадні свята «Вялікдзень» у «Чысты чацвер» прыбіралі тэрыторыю, наводзілі чысціню ў пакоі для заняткаў. Рыхтуючыся да святкавання «Купалля» (Батанічны сад, мястэчка Варчына, Польшча) і «Купальскага вечара» (Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту, пасёлак Азярцо Мінскай вобласці) падлеткі знаёміліся з рэдкімі раслінамі і г.д.

Складанасць адзначаных форм работы прадвызначыла выкарыстанне метадаў стымулявання эстэтычнай дзейнасці (педагагічнае патрабаванне, спаборніцтва, заахвочванне), кантролю і самакантролю, якія абумоўліваюць міжасабовыя стасункі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паміж удзельнікамі, выказванне імі сваёй думкі наконт выканання твора. Асобную групу складаюць метады, распрацаваныя В.А. Ясвіным і адаптаваныя намі паводле задач даследавання: метад мастацкай рэпрэзентацыі прыродных аб’ектаў прадугледжвае назапашванне эстэтычных уражанняў праз успрыманне і засваенне адлюстраваных у фальклорных творах паэтычных вобразаў прыроды; метад рытуалізацыі эстэтычнай дзейнасці накіраваны на ўшанаванне прыродных аб’ектаў у межах каляндарных абрадаў; метад экаактыўнасці прадугледжвае фарміраванне навыкаў гуманных, адказных паводзін у прыродным асяроддзі.

Такім чынам, распрацаваная намі методыка фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды ва ўдзельнікаў аматарскіх фальклорных калектываў накіравана на развіццё кагнітыўнага (укараненне ў змест выхаваўчай дзейнасці калектываў канкрэтных ведаў па эстэтычным светаўспрыманні нашых продкаў), эмацыянальнага (узбагачэнне эстэтычных уражанняў падлеткаў у працэсе непасрэднага ўзаемадзеяння з прыродным асяроддзем) і дзейнаснага (павышэнне культуры ўзаемаадносін з прыродным асяроддзем у адпаведнасці з эстэтычнымі і экалагічнымі матывамі праз практычнае засваенне мадэлей эстэтычных паводзін у прыродным ландшафце) кампанентаў фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды. У яе аснове – спалучэнне выхаваўчых магчымасцей успрымання і засваення падлеткамі паэтычнага зместу твораў фальклору (песень, казак, легенд і інш.) з пазнаннем архаічных поглядаў нашых продкаў на прыроду, камбінаванне атрыманых на занятках ведаў, уменняў і навыкаў з рэкрэатыўнымі момантамі творчага жыцця ўдзельнікаў калектыву.

Кантрольны эксперымент адлюстраваны *ў раздзеле 2.3 «Вынікі эксперыментальнай работы па фарміраванні эстэтычнага ўспрымання прыроды».* На дадзеным этапе была даказана эфектыўнасць прапанаванай методыкі – зафіксаваны станоўчыя змены кагнітыўнага, эмацыянальнага і дзейнаснага кампанентаў фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды ва ўдзельнікаў эксперыментальнай групы ў параўнанні з кантрольнай, што адлюстравана ў табліцы 1.

**Табліца 1 –** Дынаміка фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды ва ўдзельнікаў кантрольнай і эксперыментальнай груп падчас правядзення канстатуючага і кантрольнага педагагічнага эксперымента (n = 168), %

| Кампаненты | Узроўні | Этапы | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Канстатуючы | | Фарміруючы | | Кантрольны | |
| | | Эксп. гр. | Кантр. гр | Эксп. гр. | Кантр. гр. | Эксп. гр. | Кантр. гр |
| Кагнітыўны | Павярхоўны | 40,25 | 43,00 | 18,25 | 40,00 | 6,50 | 33,00 |
| | Абмежаваны | 54,25 | 53,00 | 57,00 | 54,00 | 61,00 | 57,00 |
| | Аптымальны | 5,50 | 4,00 | 24,75 | 6,00 | 32,50 | 10,00 |
| Эмацыянальны | Павярхоўны | 32,50 | 36,25 | 18,50 | 34,50 | 4,00 | 33,00 |
| | Абмежаваны | 45,00 | 40,75 | 48,00 | 37,00 | 48,00 | 36,50 |
| | Аптымальны | 22,50 | 23,00 | 33,50 | 28,50 | 48,00 | 30,50 |
| Дзейнасны | Павярхоўны | 31,00 | 33,75 | 18,00 | 34,00 | 0,75 | 34,75 |
| | Абмежаваны | 43,50 | 47,25 | 46,00 | 46,25 | 48,25 | 45,00 |
| | Аптымальны | 25,50 | 19,00 | 36,00 | 19,75 | 51,00 | 20,25 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як бачна з табліцы, канстатуючы эксперымент паказаў нязначныя разыходжанні ўзроўняў сфарміраванасці эстэтычнага ўспрымання прыроды ва ўдзельнікаў эксперыментальнай і кантрольнай груп (у абедзвюх групах пераважаюць абмежаваны і павярхоўны ўзроўні). На кантрольным этапе зафіксаваны істотны рост паказчыкаў аптымальнага ўзроўню ва ўдзельнікаў эксперыментальнай групы, у той час як у падлеткаў з кантрольнай групы пераважаюць паказчыкі абмежаванага ўзроўню. Даныя статыстычнага аналізу (Двухвыбарачны F-тэст для дысперсіі) пацвярджаюць якасны характар змен развіцця кагнітыўнага ($F_{эмп} > F_{кр}$ (2,82 > 2,40) пры $p < 0,05$ ($p = 0,02$)), эмацыянальнага ($F_{эмп} > F_{кр}$ (2,78 > 2,40) пры $p < 0,05$ ($p = 0,02$)) і дзейнаснага ($F_{эмп} > F_{кр}$ (2,95 > 2,40) пры $p < 0,05$ ($p = 0,02$)) кампанентаў ва ўдзельнікаў эксперыментальнай групы, што дазваляе меркаваць аб мэтазгоднасці і эфектыўнасці распрацаванай методыкі.

Такім чынам, эксперыментальна даказана, што распрацаваная намі методыка спрыяе фарміраванню ў падлеткаў, якія займаюцца ў аматарскіх фальклорных калектывах, эстэтычнага ўспрымання прыроды.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

**Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі**

1. Пад эстэтычным успрыманнем прыроды намі разумеецца цэласны працэс адлюстравання аб'ектаў і з'яў прыроднага наваколля, які прыводзіць да пазнання і глыбокага спасціжэння іх эстэтычнай сутнасці. Пры гэтым прадметам пазнання выступаюць выразныя ўласцівасці прыродных аб'ектаў, іх структура, форма, каляровыя спалучэнні, гукавыя варыяцыі і выкліканыя імі эстэтычныя перажыванні, пачуцці рэцыпіента, якія стымулююць эстэтычную патрэбнасць у бескарысным сузіранні прыроды. Педагагічны сэнс фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды заключаны ў развіцці неабыякавага, гуманнага, адказнага стаўлення да прыроды, замацавання вопыту жыццядзейнасці асобы па законах прыгажосці.

Эстэтычнае ўспрыманне прыроды непарыўна звязана з іншымі кампанентамі эстэтычнай свядомасці: пачуццямі, ведамі, патрэбнасцямі і інтарэсамі асобы. Яно мае ацэначны характар і залежыць ад наяўнасці ва ўспрымальніка эстэтычнага вопыту, эрудыцыі, эмацыянальнай спагадлівасці, суперажывання. Эстэтычныя пачуцці выступаюць спецыфічнай здольнасцю асобы, дзякуючы якой можна выявіць выразныя ўласцівасці прыроды, адчуць яе прыгажосць, атрымаць эмацыянальнае задавальненне ад яе непасрэднага ўспрымання. У эстэтычных эмоцыях мабілізуецца духоўная энергія чалавека, яны абуджаюць глыбокія перажыванні, пачуцці радасці, асалоды, якія складаюць аснову эстэтычнай патрэбнасці. Эстэтычныя патрэбнасці праяўляюцца праз зацікаўленасць чалавека ў эстэтычных каштоўнасцях і задавальняюцца праз успрыманне прыгажосці ў прыродзе, творах мастацтва, у справах чалавека. Эстэтычныя патрэбнасці як эмацыянальная і валявая накіраванасць чалавека стымулююць яго актыўнасць, якая праяўляецца ў імкненні да неаднаразовага ўспрымання эстэтычнага аб'екта. Эстэтычнае ўспрыманне абуджае думкі, асацыяцыі ўспрымальніка, у выніку чаго пазнаецца эстэтычная сутнасць прадмета. Пазнанне ўнутранага зместу аб'екта выражаецца ў паняццях, меркаваннях і ацэнках чалавека. Пры гэтым эстэтычная ацэнка, якая выяўляецца праз эстэтычныя катэгорыі (прыгожае, пачварнае, узвышанае, ганебнае, гарманічнае, стыхійнае і г.д.), ёсць

спосаб устанаўлення эстэтычнай каштоўнасці прадмета і ўсвядомлены вынік эстэтычнага ўспрымання.

Як элемент эстэтычнай свядомасці асобы эстэтычнае ўспрыманне прыроды ўзнікае ў выніку спалучэння трох функцыянальных узроўняў: інтэлектуальна-рацыянальнага (эстэтычныя веды, меркаванні, ацэнкі), эмацыянальна-валявога (эстэтычнае сузіранне, эмоцыі, пачуцці, патрэбнасці) і эстэтычна-дзейнаснага (эстэтычнае ўзаемадзеянне з прыродай), што дазваляе нам вылучыць кагнітыўны, эмацыянальны і дзейнасны кампаненты яго фарміравання [1; 5; 9].

2. Фальклор як сродак фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды пашырае кола эстэтычных уражанняў і ведаў падлеткаў, узбагачае іх эстэтычны вопыт шляхам успрымання і засваення разнастайных твораў народнага мастацтва. Успрыманне і засваенне эстэтычнай інфармацыі, светапоглядных ідэй, заключаных у паэтычным змесце твораў, якія фарміруюць уяўленні аб прыгажосці прыроды, выклікаюць глыбокія эстэтычныя пачуцці і перажыванні падчас успрымання аб’ектаў прыроднага наваколля, развіваюць вобразнае мысленне, дапамагаюць засваенню эстэтычных катэгорый прыгожага і ўзвышанага, высокага і нікчэмнага, добрага і благога, гарманічнага і стыхійнага. Рэалізацыі педагагічнага патэнцыялу фальклору ў фарміраванні эстэтычнага ўспрымання прыроды садзейнічае выкарыстанне ў сучасным педагагічным працэсе традыцыйна-побытавай практыкі яго ўспрымання і засваення з наступнымі характэрнымі канстытуцыйнымі прыкметамі: вуснасць, якая мабілізуе ўспрыманне фальклорных адзінак (казак, песень, танцаў і г.д.), актывізуе памяць, стымулюе паглыбленае асэнсаванне духоўнага вопыту народа; традыцыйнасць, якая забяспечвае захаванне паэтычных, музычных, тэатралізаваных і іншых формул, якія скláліся, што падахвочвае падлеткаў да суадносін мінулага вопыту з сучаснай практыкай; варыятыўнасць, якая актывізуе працэсы ўспрымання і выканання твораў фальклору; сінкрэтызм, які адлюстроўвае мастацка-змястоўную і стылявую асаблівасці фальклору, узаемаспалучэнне народнай маралі, вераванняў і мастацкага пачатку; калектыўнасць, якая грунтуецца на пераемнасці традыцыйнага вопыту грамадства.

Уключэнне падлеткаў у полімастацкую творчую дзейнасць, звязаную з аднаўленнем свят каляндарнага цыкла ў натуральных прыродна-ландшафтных умовах, забяспечвае рэалізацыю комплекснага падыходу, дзе засваенне эстэтычнага зместу фальклорнага матэрыялу адбываецца ў кантэксце прасторава-часавых умоў яго натуральнага бытавання. У полімастацкую, сінкрэтычную дзейнасць асоба ўваходзіць з пазіцыі творцы, дзе яна, карыстаючыся даступнымі ёй выяўленчымі сродкамі, можа імправізаваць, актыўна выяўляць і выказваць свае эмацыянальныя перажыванні, уключаць у свой эстэтычны вопыт светапоглядныя, эстэтычныя каштоўнасці, увасобленыя ў вобразах каляндарна-абрадавага фальклору, традыцыйна накіраванага на камунікацыю з прыродай (персаніфікаванымі сезонамі, часткамі ландшафту і г.д.). Актыўнае пагружэнне падлеткаў у шматлікія віды мастацка-творчай дзейнасці спрыяе ўсведамленню гарманічнасці, выразнасці прыроднага наваколля і яго прыгажосці, што паглыбляе эстэтычны вопыт асобы, у выніку чаго прыродныя аб’екты і з’явы ўспрымаюцца як унікальныя, самакаштоўныя, вартыя ашчадных і эстэтычных адносін з боку чалавека. На аснове гэтага фарміруецца асобасна значнае эстэтычнае стаўленне да свету, якое рэалізуецца ў паводзінах чалавека, у яго творчых і штодзённых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стасунках з прыродным светам згодна з законамі меры, гармоніі і прыгажосці [2; 4; 7–9; 16].

3. Эксперыментальная работа паказала, што эфектыўнасць фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды ва ўдзельнікаў аматарскіх фальклорных калектываў залежыць ад выканання наступных педагагічных умоў. Першая ўмова – неабходнасць стварэння народна-творчага выхаваўчага асяроддзя, якое дазваляе аднавіць спецыфіку камунікацыйнага акта, асаблівасці ідэйна-эстэтычнай макрасферы традыцыйнага соцыуму падчас узаемадзеяння падлеткаў з фальклорнымі артэфактамі. Максімальна варыятыўнае і разнастайнае па змесце, яно павінна спалучаць этнічнае (мову народа, яго светапогляд, матэрыяльную і духоўную культуру, сістэму звычаяў, абрадаў і свят), музычнае (народную музыку ў запісе, у выкананні носьбітамі вуснай традыцыі і прафесійнымі музыкантамі) і выхаваўчае (калектыў аднагодкаў, творчыя стасункі з удзельнікамі іншых фальклорных калектываў, узаемадзеянне з сям'ёй) атачэнне. Другая ўмова – арганізацыя працэсу засваення фальклору ў сінкрэтычных формах яго традыцыйнага бытавання – песнях, танцах, карагодах, казках, легендах, паданнях, якія актуалізуюць эстэтычны вопыт, мастацкія ўражанні, асацыяцыі і аналогіі падлеткаў, абуджаюць у іх пачуццё прыгажосці прыроды, гармоніі, эстэтычнай асалоды і імкненне дзейнічаць у адпаведнасці з эстэтычнымі нормамі. Трэцяя ўмова – актыўнае далучэнне падлеткаў да эстэтычнага аналізу фальклорных твораў, які патрабуе разгляду паэтычнага зместу, семантыкі і мастацкіх сродкаў фальклорнай адзінкі з пазіцыі жанравай адметнасці і змешчаных у фальклорных творах эпітэтаў, параўнанняў, метафар і інш., што ўвасабляюць прыроду, фарміруюць уяўленні пра яе прыгажосць. Успрыманне і аналіз змешчанай у фальклорных творах эстэтычнай інфармацыі вядзе да засваення эстэтыкі, духоўнасці і гармоніі, закладзеных у змесце фальклорнай адзінкі, дапамагае ўзнавіць ва ўяўленні адэкватныя прыродныя вобразы, глыбока ўсвядоміць і засвоіць іх эстэтычны змест. Суаднясенне мастацкага зместу з непасрэднымі жыццёвымі ўражаннямі, асабістымі назіраннямі дапамагае падлеткам адчуць эстэтычную каштоўнасць прыроды. Чацвёртая, вызначальная, умова – узбагачэнне эстэтычных уражанняў падлеткаў праз непасрэднае ўзаемадзеянне з натуральнымі аб'ектамі і з'явамі прыроды пасродкам удзелу ў святах каляндарнага цыкла ў натуральным прыродным ландшафце. Успрыманне маляўнічых куткоў прыроды ў спалучэнні з трансляцыяй фальклорных твораў – эталонаў гарманічнага ўзаемадзеяння з прыродай дапамагае ім усвядоміць значнасць і эстэтычную каштоўнасць прыроднай прыгажосці, садзейнічае назапашванню вопыту эстэтычнай дзейнасці ў прыродным ландшафце [2; 3; 10; 11; 13].

4. Паступальнае развіццё эстэтычнага ўспрымання прыроды ва ўдзельнікаў аматарскіх фальклорных калектываў прадугледжвае мэтанакіраванае фарміраванне кагнітыўнага, эмацыянальнага і дзейнаснага кампанентаў. Крытэрыямі развіцця кагнітыўнага кампанента з'яўляюцца разуменне падлеткамі мастацкага зместу эстэтычнага пераўтварэння прыродных вобразаў у фальклорных творах і ўменне падлеткаў аргументаваць уласныя эстэтычныя меркаванні на аснове аналізу разнастайных фальклорных твораў. Развіццё кагнітыўнага кампанента прадугледжвае паглыбленне і пашырэнне ведаў падлеткаў у галіне міфалагічнага і эстэтычнага ўспрымання прыроды нашымі продкамі, засваенне звестак аб спецыфіцы абрадавай і святочнай культуры Беларусі. Гэтыя веды ўдасканальваюць навыкі эстэтычнага аналізу падлеткамі фальклорных твораў, развіваюць іх здольнасці да аргументацыі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

уласных эстэтычных меркаванняў, эстэтычнай ацэнкі твораў народнага мастацтва (казак, песень, легенд, паданняў, жартаў) – сродкаў фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды. Для актывізацыі дадзенага кампанента намі былі выкарыстаны групавыя і індывідуальныя формы работы, а таксама славесныя (паведамленне, гутарка, тлумачэнне), наглядныя (ілюстрацыя, дэманстрацыя), практычныя (практыкаванне) і іншыя метады.

Крытэрыямі сфарміраванасці эмацыянальнага кампанента з'яўляюцца любаванне прыгажосцю, гукамі і фарбамі прыроды, эмпатыя і суперажыванне прыродзе. Эмацыянальны кампанент развіцця эстэтычнага ўспрымання прыроды характарызуе эстэтычныя перажыванні асобы, яе ўменні заўважаць, вылучаць і адэкватна ўспрымаць выразныя ўласцівасці прыродных аб'ектаў, атрымліваць разнастайныя эстэтычныя ўражанні, задавальненне падчас стасункаў з жывой прыродай. Для развіцця дадзенага кампанента выкарыстоўваліся распаўсюджаныя формы арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці – экскурсіі, краязнаўчыя вандроўкі, наведванне ўдзельнікамі фальклорных калектываў выстаў народнай творчасці ў спалучэнні з выкананнем празаічных вусна-паэтычных твораў. Аб'ектамі экскурсійнай дзейнасці былі як прыродныя, так і культурныя помнікі, ландшафты, дзе культура і прырода выступаюць у непарыўным адзінстве. Непасрэднае ўзаемадзеянне з непаўторнымі маляўнічымі прыроднымі мясцінамі і аб'ектамі, задавальняючымі пазнавальныя, краязнаўчыя патрэбнасці асобы спрыяла далучэнню падлеткаў да вывучэння гісторыі роднага краю, гістарычных месцаў, помнікаў культуры. Назіранне за прыроднымі аб'ектамі і з'явамі, пошук вобразна-асацыятыўных аналогій з разгледжанымі і развучанымі на занятках творамі фальклору, іх ацэнка як крыніцы глыбокіх эстэтычных перажыванняў і пачуццяў чалавека – гэта вядучыя метады, якія абудзілі патрэбнасць у суаднясенні па прынцыпе падабенства вобразаў прыроды з узвышанымі якасцямі чалавека, якія ўвасабляюць эстэтычны ідэал, дабро, справядлівасць, ісціну.

Крытэрыямі сфарміраванасці дзейнаснага кампанента служаць цікавасць да эстэтычнай дзейнасці і патрэбнасць у бескарысным сузіранні прыроды. Дзейнасны кампанент развіцця эстэтычнага ўспрымання прыроды адлюстроўвае імкненне падлеткаў да эстэтычнага ўзаемадзеяння з прыродай, іх жаданне ўвасабляць прыгажосць прыроды ў вершах, песнях, фотаздымках і інш., патрэбнасць у неаднаразовым успрыманні прыродных аб'ектаў з мэтай адчуць асалоду, радасць ад сустрэчы з прыгожымі з'явамі, атрымаць задавальненне ад уласных гарманічных паводзін у прыродным наваколлі. Развіццё дадзенага кампанента прадугледжвала арганізацыю канцэртна-выканальніцкай дзейнасці фальклорных калектываў, удзел падлеткаў у канцэртах і конкурсах, фестывалях і масавых святах, у традыцыйных каляндарна-абрадавых святах, якія праводзяцца ў натуральных прыродна-ландшафтных умовах. Складанасць адзначаных форм сацыякультурнай дзейнасці абумовіла выкарыстанне метадаў стымулявання эстэтычнай дзейнасці (педагагічнае патрабаванне, спаборніцтва, заахвочванне), метадаў кантролю і самакантролю. Асобную групу складаюць адаптаваныя намі метады мастацкай рэпрэзентацыі прыродных аб'ектаў, рытуалізацыі эстэтычнай дзейнасці, экаактыўнасці, якія садзейнічаюць назапашванню вопыту эстэтычнага ўзаемадзеяння падлеткаў з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэальнымі аб’ектамі і з’явамі прыроды, засваенню мадэлей гуманных, адказных паводзін у прыродным асяроддзі.

Вынікі апрабацыі пацвярджаюць адэкватнасць прапанаванай методыкі, паколькі былі зафіксаваны станоўчыя змены кампанентаў развіцця эстэтычнага ўспрымання прыроды ў большасці выхаванцаў эксперыментальнай групы. Кантрольныя дыягнастычныя працэдуры (анкетаванне, гутаркі з удзельнікамі аматарскіх фальклорных калектываў, інтэрв’юіраванне кіраўнікоў калектываў, уключанае назіранне падчас правядзення канцэртаў і выступленняў), статыстычная апрацоўка даных указваюць на значныя адрозненні паміж кантрольнай і эксперыментальнай групамі і сведчаць аб паспяховым фарміраванні эстэтычнага ўспрымання прыроды ва ўдзельнікаў эксперыментальнай групы ў параўнанні з кантрольнай. Распрацаваная намі методыка спрыяе фарміраванню ў падлеткаў – удзельнікаў аматарскіх фальклорных калектываў эстэтычнага ўспрымання прыроды [1–3; 5; 6; 12; 14; 15; 17–19].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Вынікі дысертацыйнага даследавання (спецыфіка, прынцыпы, функцыі, педагагічныя ўмовы фарміравання ў падлеткаў эстэтычнага ўспрымання прыроды ў дзейнасці аматарскіх фальклорных калектываў) укаранёны ў практыку работы дзіцячых фальклорных калектываў (акты аб практычным выкарыстанні ад 01.02.2011, 21.11.2011, 15.12.2011, 01.02.2012, 13.04.2012).

На падставе матэрыялаў дысертацыі распрацаваны вучэбныя праграмы: «Методыка экспедыцыйных этнамузыкалагічных даследаванняў», «Этнапедагогіка», якія выкарыстоўваюцца ў навучальным працэсе УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» па дысцыплінах: «Методыка экспедыцыйных этнамузыкалагічных даследаванняў: этнамузыкалагічны практыкум», «Этнапедагогіка» (акт аб практычным выкарыстанні ад 14.06.2012).

Матэрыялы дысертацыі, якія раскрываюць спецыфіку фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды сродкамі рэгіянальнага фальклору, выкарыстоўваюцца ў навучальным працэсе устаноў вышэйшай адукацыі, факультэтаў культуры і мастацтваў у межах вывучэння прадметаў «Эколага-культурная дзейнасць», «Фальклорны практыкум: беларускі народны каляндар», «Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці: рэжысура каляндарных абрадаў» (акты аб практычным выкарыстанні ад 15.02.2012, 17.02.2012, 14.06.2012).

Змест, методыка і атрыманыя вывады дысертацыі будуць карыснымі кіраўнікам дзіцячых аматарскіх фальклорных калектываў для праектавання аналагічнай педагагічнай сістэмы па фарміраванні ў дзяцей і падлеткаў эстэтычнага ўспрымання прыроды сродкамі рэгіянальнага фальклору.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ СУІСКАЛЬНІКА

### Артыкулы ў навуковых рэцэнзуемых часопісах

1. Петухова, Н.В. Эстэтычнае ўспрыманне прыроды ўдзельнікаў аматарскіх фальклорных калектываў / Н.В. Петухова // Сацыяльна-педагагічная работа. – 2009. – № 6. – С. 27–31.

2. Петухова, Н.В. Фарміраванне эстэтычнага ўспрымання прыроды ў удзельнікаў каляндарных абрадаў / Н.В. Петухова // Пазашкольнае выхаванне. – 2010. – № 4. – С. 17–21.

3. Петухова, Н.В. Праблемы засваення народна-песенных традыцый у практыцы фальклорных калектываў / Н.В. Петухова // Пазашкольнае выхаванне. – 2011. – № 5. – С. 3–7.

4. Петухова, Н.В. Фальклор як сродак фарміравання ў дзяцей эстэтычнага ўспрымання прыроды / Н.В. Петухова // Роднае слова. – 2011. – № 10. – С. 79–81.

5. Петухова, Н.В. Фарміраванне ў падлеткаў эстэтычнага ўспрымання прыроды сродкамі фальклорных калектываў / Н.В. Петухова // Сацыяльна-педагагічная работа. – 2011. – № 12. – С. 17–21.

### Артыкулы ў навуковых зборніках

6. Петухова, Н.В. Магчымасці фальклору ў фарміраванні эстэтычнага ўспрымання прыроды ў дзяцей / Н.В. Петухова // Фалькларыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі : зб. арт. / пад навук. рэд. Р.М. Кавалёвай, В.В. Прыемка. – Мінск : РІВШ, 2011. – Вып. 8. – С. 222–227.

7. Петухова, Н.В. Святы каляндарнага цыкла як фактар фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды / Н.В. Петухова // Фалькларыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі : зб. арт. / пад навук. рэд. Р.М. Кавалёвай, Т.В. Лук'янавай ; уклад. В.В. Прыемка ; БДУ. – Мінск : Права і эканоміка, 2012. – Вып. 9. – С. 327–330.

### Артыкулы ў матэрыялах канферэнцый

8. Петухова, Н.В. Этнакультурнае выхаванне ў дзіцячых фальклорных гуртах і этнаэкалогія / Н.В. Петухова // Традыцыйная культура і дзеці. Праблема этнавыхавання : матэрыялы III Рэсп. навук.-практ. канф. (Акцябрскі, 19–20 крас. 2006 г.) / аўт. праекта і ўклад. М.А. Козенка. – Мінск : БелДІПК, 2006. – Вып. 2. – С. 62–65.

9. Петухова, Н.В. Фарміраванне ў дзяцей эстэтычных адносінаў да прыроды сродкамі фальклору / Н.В. Петухова // Женщина. Общество. Образование : материалы 11 междунар. междисциплин. науч.-практ. конф. (Мінск, 19–20 дек. 2008 г.). : в 2 т. – Мінск : ЖИ ЭНВИЛА 2009. – Т. 2. – С. 105–108.

10. Петухова, Н.В. Эстэтыка-выхаваўчы ўплыў народнай песні на асобу дзіцяці ў працэсе дзейнасці фальклорнага гурта / Н.В. Петухова // Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, перайманне : зб. навук. прац удзельнікаў II Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 23 крас. 2008 г.). – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – С. 37–39.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

11. Петухова, Н.В. Педагагічныя ўмовы фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды ўдзельнікамі дзіцячага фальклорнага калектыву / Н.В. Петухова // Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, перайманне : зб. навук. прац удзельнікаў III Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 29 крас. 2009 г.). – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – С. 105–107.

12. Петухова, Н.В. Рэалізацыя педагагічнага патэнцыялу фальклору ў дзейнасці дзіцячых фальклорных калектываў / Н.В. Петухова // Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, перайманне : зб. навук. прац удзельнікаў IV Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 29–30 крас. 2010 г.). – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2010. – С. 154–156.

13. Петухова, Н.В. Развіццё эстэтычнага ўспрымання прыроды ў падлеткаў у аматарскіх фальклорных калектывах / Н.В. Петухова // Фальклор і сучасная культура : матэрыялы III Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 18 крас. 2011 г.) / Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2011. – С. 23–25.

14. Петухова, Н.В. Да праблемы актуалізацыі традыцыйнага народнага мастацтва ў дзейнасці аматарскіх фальклорных калектываў / Н.В. Петухова // Беларуская культура ва ўмовах глабалізацыі : матэрыялы навук. канф., прысвеч. 35-годдзю БДУКМ (Мінск, 3 снеж. 2010 г.) : у 2 т. / рэдкал.: М.А. Мажэйка (старш.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2011. – Т. 2. – С. 302–305.

15. Петухова, Н.В. Методыка фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды ўдзельнікамі аматарскіх фальклорных калектываў / Н.В. Петухова // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навук. прац удзельнікаў V Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 29–30 крас. 2011 г.). – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2011. – С. 191–193.

16. Петухова, Н.В. Развіццё эстэтычнага ўспрымання прыроды падлеткаў у працэсе фальклорнага выканальніцтва / Н.В. Петухова // Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, успрымання : зб. навук. прац удзельнікаў VI Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 29–30 крас. 2012 г.). – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2012. – С. 138–140.

**Вучэбна-метадычныя выданні**

17. Петухова, Н.В. Этнокультурное воспитание детей в фольклорном коллективе / Н.В. Петухова // Педагогика ненасилия в социокультурной деятельности : сб. науч. ст. / под ред. В.Н. Наумчика. – Минск : Четыре четверти, 2009. – С. 221–230.

18. Петухова, Н.В. Методыка экспедыцыйных этнамузыкалагічных даследаванняў : вучэб. праграма для вышэйшых навучальных установ па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць па напрамку (напрамках) спецыяльнасці 1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор) / Н.В. Петухова. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2012. – 27 с.

19. Петухова, Н.В. Этнапедагогіка : вучэб. праграма для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць па напрамку (напрамках) спецыяльнасці 1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор) / Н.В. Петухова. – Мінск : РІВШ, 2012. – 12 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РЭЗЮМЭ

**Петухова Наталля Вячаславаўна**

## ФАРМІРАВАННЕ ЭСТЭТЫЧНАГА ЎСПРЫМАННЯ ПРЫРОДЫ Ў ПАДЛЕТКАЎ – УДЗЕЛЬНІКАЎ АМАТАРСКІХ ФАЛЬКЛОРНЫХ КАЛЕКТЫВАЎ

**Ключавыя словы:** эстэтычнае ўспрыманне прыроды, аматарская мастацкая творчасць, аматарскі фальклорны калектыў, педагагічныя ўмовы, методыка фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды ў падлеткаў.

**Мэта даследавання** – распрацоўка тэарэтычных асноў і методыкі фарміравання ў падлеткаў эстэтычнага ўспрымання прыроды ў працэсе арганізаванай дзейнасці аматарскіх фальклорных калектываў.

**Метады даследавання:** тэарэтычныя (сістэматызацыя, класіфікацыя, параўнальны аналіз, сінтэз, абагульненне), якія дазволілі вызначыць падыходы да працэсу фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды сродкамі фальклору; мадэляванне педагагічных умоў фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды; эмпірычныя (анкетаванне, назіранне, абагульненне перадавога педагагічнага вопыту эстэтычнага выхавання падлеткаў, аналіз творчай дзейнасці ўдзельнікаў аматарскіх фальклорных калектываў); эксперыментальныя (канстатуючы, фарміруючы і кантрольны педагагічны эксперымент, вопытна-эксперыментальная работа); метады матэматычнай статыстыкі.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна:** абагулены і сістэматызаваны педагагічныя погляды на фарміраванне ў падлеткаў эстэтычнага ўспрымання прыроды сродкамі фальклору; вызначаны, тэарэтычна абгрунтаваны і праверены падчас эксперыментальнай работы педагагічныя ўмовы эфектыўнага фарміравання ў падлеткаў эстэтычнага ўспрымання прыроды ў працэсе арганізаванай дзейнасці аматарскіх фальклорных калектываў; распрацавана методыка фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды ва ўдзельнікаў аматарскіх фальклорных калектываў.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні**

Матэрыялы дысертацыі могуць выкарыстоўвацца ў практыцы работы з аматарскімі фальклорнымі калектывамі клубных, сярэдніх і сярэднеспецыяльных навучальных устаноў, арыентаваных на мэтанакіраванае эстэтычнае выхаванне дзяцей і моладзі; у адукацыйным працэсе вышэйшых навучальных устаноў, факультэтаў культуры і мастацтваў па прадметах «Фальклорны практыкум: беларускі народны каляндар», «Методыка экспедыцыйных этнамузыкалагічных даследаванняў: этнамузыкалагічны практыкум», «Эколага-культурная дзейнасць», «Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці: рэжысура каляндарных абрадаў», «Этнапедагогіка».

**Галіна выкарыстання:** педагогіка сацыякультурнай дзейнасці, практыка арганізаванага мастацкага аматарства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**РЕЗЮМЕ**

**Петухова Наталья Вячеславовна**

# ФОРМИРОВАНИЕ ЭСТЕТИЧЕСКОГО ВОСПРИЯТИЯ ПРИРОДЫ У ПОДРОСТКОВ – УЧАСТНИКОВ ЛЮБИТЕЛЬСКИХ ФОЛЬКЛОРНЫХ КОЛЛЕКТИВОВ


**Ключевые слова:** эстетическое восприятие природы, любительское художественное творчество, любительский фольклорный коллектив, педагогические условия, методика формирования эстетического восприятия природы у подростков.

**Цель исследования** – разработка теоретических основ и методики формирования у подростков эстетического восприятия природы в процессе организованной деятельности любительских фольклорных коллективов.

**Методы исследования:** теоретические (систематизация, классификация, сравнительный анализ, синтез, обобщение), позволяющие определить подходы к процессу формирования эстетического восприятия природы средствами фольклора; моделирование педагогических условий формирования эстетического восприятия природы; эмпирические (анкетирование, наблюдение, обобщение передового педагогического опыта эстетического воспитания подростков, анализ творческой деятельности участников любительских фольклорных коллективов); экспериментальные (констатирующий, формирующий и контрольный педагогический эксперимент, опытно-экспериментальная работа); методы математической статистики.

**Полученные результаты и их новизна:** обобщены и систематизированы педагогические взгляды на формирование у подростков эстетического восприятия природы средствами фольклора; определены, теоретически обоснованы и проверены в экспериментальной работе педагогические условия эффективного формирования у подростков эстетического восприятия природы в процессе организованной деятельности любительских фольклорных коллективов; разработана методика формирования эстетического восприятия природы у участников любительских фольклорных коллективов.

**Рекомендации по использованию**

Материалы диссертации могут быть использованы в практике работы любительских фольклорных коллективов клубных, средних и среднеспециальных учебных заведений, ориентированных на целенаправленное эстетическое воспитание детей и молодежи; в образовательном процессе высших учебных заведений, гуманитарных факультетов университетов культуры и искусств по предметам «Фольклорный практикум: белорусский народный календарь», «Методика экспедиционных этномузыкологических исследований: этномузыкологический практикум», «Эколого-культурная деятельность», «Методика организации фольклорной деятельности», «Этнопедагогика».

**Область применения:** педагогика социокультурной деятельности, практика организованного любительского творчества.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## SUMMARY

**Petukhova Natalia Wiacheslavovna**

## FORMATION OF THE AESTHETIC PERCEPTION OF NATURE IN ADOLESCENTS – PARTICIPANTS OF AMATEUR FOLK ENSEMBLES

**Keywords**: aesthetic perception of nature, amateur arts, an amateur folk group, pedagogical conditions, method of formation of the aesthetic perception of nature in adolescent.

**Aim of research** – to elaborate theoretical foundations and methods of forming adolescent aesthetic perception of nature in the organized activity of amateur folk groups.

**Methods of research**: theoretical (systematization, classification, comparative analysis, synthesis, generalization), which allowed us to determine approaches to the formation of the aesthetic perception of nature by the means of folklore; theoretical modelling of pedagogical conditions of the formation of the aesthetic perception of nature; empirical (survey, observation, a compilation of best educational experience training and educating young people, the creative activity analysis of the amateur folk groups participants), experimental (ascertaining, shaping and controlling the stages of the pedagogical experiment, experimental work), and methods of mathematical statistics.

**Received results and their scientific circulation**: summarized and systematized pedagogical views on the formation of adolescent aesthetic perception of nature by the means of folklore; defined, theoretically grounded and tested in the experimental work of pedagogical conditions of effective formation of the adolescent aesthetic perception of nature in the organized activities of amateur folk ensembles; developed technique of the aesthetic perception of nature in the participants of amateur folk ensembles.

**Recommendation for application**

Materials and results of the dissertation may be used in the practice of working with amateur folklore ensembles in clubs, middle and secondary schools, aimed at targeting the aesthetic education of children and youth; in the educational process of high schools and departments of culture and arts within the subject «Folklore Practical Training Session: folk Calendar», «Ethnomusicological expeditionary research methods: Ethnomusicological session», «Environmental and cultural activities», «Methods of organizing folk activities», «Ethnopedagogy».

**Scope**: social and cultural activities pedagogy, the organized amateur creativity practice.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навуковае выданне

**Петухова Наталля Вячаславаўна**

**ФАРМІРАВАННЕ ЭСТЭТЫЧНАГА ЎСПРЫМАННЯ ПРЫРОДЫ Ў ПАДЛЕТКАЎ – УДЗЕЛЬНІКАЎ АМАТАРСКІХ ФАЛЬКЛОРНЫХ КАЛЕКТЫВАЎ**

**Аўтарэферат**

дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата педагагічных навук

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падпісана ў друк 17.12.2012 г. Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$. Папера пісчая № 2.
Друк лічбавы. Ум. друк. арк. 1,44. Ул.-выд. арк. 1,77. Заказ № 322. Тыраж 60 экз.

Надрукавана на рызографе
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск